УДК УДК 811.111’42

# КАНЦЭПТ “WOMAN” У АНГЛАМОЎНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ

***А. В. Ткачова*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кіраўнік ***А. В. Доўгаль***,
канд. філал. навук, дацэнт

Канцэпт “woman” з’яўляецца адным з найбольш значных канцэптаў нацыянальнай моўнай карціны свету. Рускі даследчык Н. А. Паскова на матэрыяле тэкстаў сярэднеанглійскага перыяду (XII–XV стст.) вы-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

лучыла 2 асноўныя (асоба і жаночы пол) і 7 дадатковых прымет канцэпту “woman” (узрост, род дзейнасці, становішча ў грамадстве, роднасныя адносіны, сямейны стан, узаемаадносіны з асобамі мужчынскага полу, характар / паводзіны) [1, с. 133]. Тлумачальны слоўнік англійскай мовы “The Concise Oxford Dictionary of Current English” [2] фіксуе цэлы шэраг лексічных адзінак, якія з’яўляюцца рэпрэзентантамі канцэпту “woman”. Агульным найменнем для асоб жаночага полу выступаюць лексемы *woman, female.* Сучасны вобраз жанчыны характарызуюць назвы *businesswoman, model, mother, wife, housewife, socialite*. Намінацыі могуць утвараць бінарныя апазіцыі і проціпастаўляюцца па ўзросце (*woman – girl, mother – daughter, grandmother*), ступені роднасці (*mother – aunt, mother – grandmother, mother – wife, mother – sister*), сферы ўжывання, стылістычнай афарбоўцы (*mother – mum, grandmothe – granny, wife – spouse*). Частка лексем адлюстровае сацыяльны статус жанчыны ў англійскім грамадстве (*princesse, queen, lady, dame*) або сямейнае становішча (*miss, missis, bride, fiancée, widow*). Семантычная прымета, звязаная з узаемаадносінамі з мужчынскім полам, прысутнічае ў словах *girlfriend, inamorata, mistress.* Сема ‘прафесія’ ўласціва лексемам *midwife, actress, housewife, charwoman, hen-wife, maid.* Слова *miss* можа ўжывaецца пры звароткy як да незамужняй жанчыны, так і да настаўніцы незалежна ад яе сямейнага становішча. Найменні *female, fair sex* характарызуюць жанчыну толькі з гендэрнага боку.

Такім чынам, канцэпт “жанчына” прадстаўлены ў англійскай мове разнастайнымі лексічнымі адзінкамі, якія рэпрэзентуюць як біялагічную, так і сацыяльную сутнасць жанчыны.

**Літаратура**

1. Паскова, Н. А. Женщина / Н . А. Паскова // Антология концептов; под ред. В . И. Карасика, И . А. Стернина. – Москва : Гнозис, 2007. – С. 132–145.

2. Fowler, H. W. The Concise Oxford Dictionary of Current English / H. W. Fowler. – Oxford University Press, 1964. – 1558 p.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова